ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратаколам
Савета аддзела культуры
Пінскага райвыканкама
ад 04.07.2022 № 6
г. Пінск

Аб выніках раённага інтэрнэт - конкурсу
«Звіні, спявай, Купалаўская ліра!»
на лепшае выкананне вершаў Я.Купалы

З мэтай азнаменавання 140-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы, папулярызацыі творчай спадчыны пісьменніка і паэта, прывіцця любові да роднай мовы, павышэння цікавасці да чытання, выхавання патрыятычнага пачуцця гонару і любові да роднага краю, развіцця творчай актыўнасці чытачоў у дзяржаўнай установе культуры «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» адбыўся інтэрнэт-конкукурс “Звіні, спявай, Купалаўская ліра!”.

У раённым інтэрнэт-конкурсе прымалі ўдзел 41 чалавек, было прадстаўлена 32 відэаматэрыялаў.

Разглядзеўшы конкурсные матэрыялы, Савет аддзела культуры Пінскага райвыканкама ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прызнаць пераможцамі раённага інтэрнэт-конкурсу «Звіні, спявай, Купалаўская ліра!» сярод дарослых з уручэннем Дыпломаў аддзела культуры Пінскага райвыканкама і падарункаў:
   - Калькова Таццяна Мікалаеўна, в.Стытычава – 1 месца за выкананне верша Я.Купалы «Спадчына»;
   - Казубоўская Марыя Мікалаеўна, г.п.Лагішын – 2 месца за выкананне верша Я.Купалы «Не шукай»;
   - Галёта Кацярына Анатолеўна, в. Табулкі – 3 месца за выкананне верша Я.Купалы «Родныя вобразы».
2. Прызнаць пераможцамі раённага інтэрнэт-конкурсу «Звіні, спявай, Купалаўская ліра!» ў узроставай катэгорыі ад 5 да 18 гадоў з уручэннем Дыпломаў аддзела культуры Пінскага райвыканкама і падарункаў:
   - Ярмольчык Алена, в.Лемяшэвічы - 1 месца за выкананне верша Я.Купалы «Алеся»;
   - Лазюк Мікіта Сяргеевіч, в.Валішча – 2 месца за выкананне верша Я.Купалы «Вёска»;
   - Кавалевіч Аляксандра Раманаўна, в.Ставок, - 3 месца за выкананне верша Я.Купалы «Вобразы мілыя роднага краю».

3. Кантроль за выкананнем Пастановы ўскласці на дырэктара Антанчук В.М. ДзУК Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».